**ДУК “Сетка публічных бібліятэк Глускага раёна”**
Глусская цэнтральная раённая бібліятэка
Інфармацыйна-ідэялагічны цэнтр

# У храма шчаслівы лёс



## Свята-Казьмадзям’янаўскай царкве 200 гадоў

**Глуск 2016**

У храма шчаслівы лёс. Свята-Казьмадзям’янаўскай царкве 200 гадоў /ДУК “Сетка публічных бібліятэк Глускага раёна, Глуская цэнтральная раённая бібліятэка; [складальнік Сысой А.І., адказны за выпуск Малашук І.А.]. – Глуск. – 2016. – 8 с.

ДУК “Сетка публічных бібліятэк Глускага раёна”

На заходняй ўскраіне вёскі Гарадок стаіць самы стары храм, адзіны ацалелы па савецкай ўладзе не толькі на Глушчыне, але і наўсіх берагах Пцічы. Гэта Казьмадзям’янаўская царква, пабудаваная ў 1814  годзе ў гонар перамогі над Напалеонам.

Храм носіць імя святых бяссрэбранікаў братоў Казьмы і Даміяна, якія нарадзіліся ў Азіі і жылі ў III стагоддзі. Бацька іх быў грэкам і пакланяўся язычніцкім багам. Маці Феадоція наадварот, спавядала хрысціянскую веру. Рана стаўшы ўдавой, яна праводзіла жыццё набожнае, богаўгоднае, чаму вучыла і сваіх дзяцей. Выхаваныя ў строгай набожнасці, святыя Казьма і Даміян, стаўшы дарослымі, як два светача, прасіялі добрымі справамі. Каб прыносіць больш карысці людзям, яны заняліся медыцынскай навукай, вывучалі цалебныя ўласцівасці траў, раслін і праславіліся як  адмысловыя ўрачы. З поспехам вылечваючы хворых, яны ні ад кога не бралі грошай,  лячылі людзей дзеля Бога, таму яны і называюцца бяссрэбранікамі. Пражыўшы жыццё мірнае і працавітае, браты спакойна адышлі к Госпаду і былі пахаваны ў Ферамане (Месапатамія). І зараз усім з верай і надзеяй прыходзячым і просячым, даюць дапамогу і пазбаўленне аб хвароб.



Годам пабудовы храма па адных крыніцах значыцца 1866-й, па іншых датай яго будаўніцтва лічыцца 1814 год, а наогул, на гэтым месцы царква стаяла ўжо ў сярэдзіне XVII стагоддзя. За царквой пахаваныя святары, якія ў ёй служылі. Адна магіла датавана 1855 годам, іншая - 1789, ёсць яшчэ дзве магілы, у якіх крыжы выкладзеныя гарызантальна, проста на зямлі. І гэта, магчыма, канец XVII - пачатак XVIII стагоддзя. Так што версія аб 1814 годдзе найбольш верагодная. Хутчэй за ўсё, у 1866 ён быў часткова рэканструяваны, работы вакол яго працягваліся і пазней.

Царкоўная брама і агароджа былі пабудаваныя ў 1905 годзе, у той жа перыяд  царкву абабілі вагонкай, ў куце царкоўнай агароджы  знайшлі рэшткі значна больш старой пабудовы, гэта, так званая, трупярня.



Сюды звозілі людзей, якія памерлі альбо загінулі пры невядомых, нявысветленых абставінах: кагосьці задралі ваўкі, кагосьці забілі разбойнікі, хтосьці сам быў разбойнікам, хтосьці патануў ... Раз у тры месяцы сюды прыязджаў епіскап, адпяваў гэтых людзей, і толькі пасля гэтага іх хавалі.

У дарэвалюцыйны час у Гарадку быў самы вялікі прыход, туды ўваходзіла само мястэчка і яшчэ 16 навакольных вёсак з колькасцю насельніцтва звыш чатырох з паловай тысяч чалавек, а да царквы былі прыпісаны капліца ў вёсцы Жалвінец і драўляная царква ў Сіманавічах, пазней спаленая.

Можна сказаць, што ў Казьмадзяміянаўскай царквы шчаслівы лёс. І не толькі таму, што, ўся зрашэчаная, яна выстаяла ў апошнюю вайну. Савецкая ўлада прыйшла ў гэтыя месцы ў 1917 годдзе, і за ўвесь час яе праўлення храм быў зачынены ўсяго на некалькі месяцаў: перад самым пачаткам Вялікай Айчыннай вайны невялікай яўрэйскай арцелі ўдалося пераканаць прадстаўнікоў мясцовай ўлады, што ў храме варта спыніць набажэнствы і адкрыць тут ганчарную вытворчасць. Так і зрабілі, але, калі прыйшла вайна, царкву адкрылі акупацыйныя ўлады, і так здарылася, што першымі пацярпелымі з яўрэяў сталі работнікі менавіта ганчарнай арцелі.

За той кароткі час, калі царква была зачынена, яе не паспелі ні разрабаваць, ні падвергнуць якім-небудзь зменам. Шмат намаганняў да захавання храма ў той час, падтрымання веры ў яго прыхаджанах, зрабіў свяшчэннік айцец Георгій Семянюк. Ветэран вайны, з баямі прайшоў да самага Берліна. 28 гадоў ён аддаў служэнню ў Казьмадзям'янаўскай царкве і мірна спачыў у 2004 годзе. У розны час там служылі розныя свяшчэннікі, некаторыя з іх пахаваны на могілках, што на тэрыторыі царквы.




Гарадкоўскі храм не толькі адзін са старэйшых у нашай вобласці, але і адзін з нямногіх, што знаходзяцца пад аховай дзяржавы, паколькі мае статус *гістарычна-культурнай каштоўнасці* Рэспублікі Беларусь 3-й ступені.

Казьмадзям'янаўская царква – помнік народнага драўлянага дойлідства з выкарыстаннем стылізаваных элементаў класіцызму.

Будынак складаецца з прамавугольнага асноўнага аб’ёму, пяціграннай апсіды, трох’яруснай званіцы і бабінца. Накрыта двухсхільным дахам з вальмамі над апсідай. З боку галоўнага фасада званіца (васьмярык на чацверыку), завершаная паўсферычным купалам. Над асноўным аб’ёмам – васьмігранны самкнуты купал на гранёным светлавым барабане. Сцены прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі, якія абрамлены ліштвамі з сандрыкамі. Вуглавыя часткі будынка ўмацаваны драўлянымі лапаткамі. Галоўны ўваход вырашаны ў выглядзе стылізаванага порціка. Унутраная прастора царквы развіта па падоўжнай восі. Светлавы барабан з васьміграннным самкнутым скляпеннам падтрымліваецца 8 слупамі. У дэкоры інтэр’ера шырока выкарыстана разьба па дрэве.



**14 лістапада 2014** года тут адбылося юбілейнае прастольнае свята. Шмат паломнікаў з’ехалася ў храм святых бяссрэбранікаў Казьмы і Даміяна каб адзначыць **200-годдзе** мясцовай царквы. Святочнае набажэнства праводзіў епіскап Бабруйскі і Быхаўскі Серафім у саслужэнні з кліpам епархіі.

Вельмі шмат веруючых прыехалі сюды каб саборна ўзнесці



свае малітвы Богу. Тут і падзяка, што праз стагоддзі і выпрабаванні Ён захаваў гэты храм. Тут і гарачыя просьбы аб зберажэнні міру на нашай Богахаванай зямлі, аб дараванні міру і спакою нашым сэрцам, мірнага і бязгрэшнага жыцця і хлеба надзённага нам і нашым блізкім. Служба была наколькі прыгожай – ад святочных убораў іерэяў і дыяканаў, ад надзвычай зладжаных малітоўных спеваў царкоўнага хору, - настолькі глыбокай па сваім духоўным змесце, па агульнай малітве клірыкаў і міран. Шмат хто падрыхтаваў сябе да прыняцця святой Прычасці – да Чашы падыходзілі мужчыны і жанчыны, старыя, моладзь, дзеці – каб злучыцца з Богам і адзін з адным. Пасля літургіі ўсе прайшлі хрэсным ходам вакол храма, міма магіл з крыжамі, дзе пахаваны гарадкоўскія святары.



Настаяцелем Казьмадзям’янаўскай царквы ў цяперашні час з’яўляецца іераманах ***Аляксандр Фёдараў***. У Гарадку



айцец Аляксандр служыць з 2000 года. За гэты час будынак храма быў істотна падрамантаваны, зроблены рамонт купала і даху, які быў пашкоджаны яшчэ ў вайну, а ў гады савецкай ўлады пра выдзяленне спецыяльнай тэхнікі і спецыялістаў для правядзення рамонту не магло ісці і гаворкі. Неабходныя ўмацаванні тут былі зроблены толькі ў 2004 годдзе. Калі свае намаганні аб’ядналі народны ўмелец А.П. Баярка і УКП “Жылкамгас” у асобе яго дырэктара Г.С. Шуміна. Была задзейнічана неабходная тэхніка, зроблены патрэбныя работы і храм быў літаральна выратаваны. Напярэдадні 200-гадовага юбілею з дапамогай ПМК-249 была адрамантавана царкоўная агароджа, ухіленне дэфектаў унутры і звонку храма.

Зараз, нягледзячы на аддалёнасць ад раённага цэнтра, Свята-Казьмадзям’янаўскі храм у вёсцы Гарадок з’яўляецца адным з шанаваных і часта наведваемых веруючымі і турыстамі месцаў.

## Бібліяграфія:


1. Да 200-годдзя рукой падаць.Казьмадзям’янаўская царква на плынях гісторыі // Радзіма – 2004 – 12 лістапада. – С.2.
2. Казьмадзям’янаўская царква (в. Гарадок) // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. – Мн.: Бел. сав. энцыклапедыя. – 1986. – С.174.
3. Кашенок Ф. Здоровая душа – здоровое тело /Ф. Кашенок // Радзіма – 2005. – 11 лістапада. – С.2.
4. Лукашэвіч Т. Тут маліліся два вякі / Т. Лукашэвіч //Радзіма. – 2014. - № 84. – С.3.
5. Лукашэвіч Т. Храмавае свята ў Гарадку // Т. Лукашэвіч //Радзіма. – 2014. - № 89. – С.3.

***Казьмадзям'янаўская царква***
***Унутраны інтэръер храма***





***Каштоўныя рэліквіі храма XVIII стагоддзя***



***Царкоўны крыж***



***Евангелле***





***Іконы Архангелаў Міхаіла і Гаўрыіла***

# У храма шчаслівы лёс.
# Казьмадзям'янаўскай царкве 200 гадоў



**Складальнік Сысой А.І.**
**Адказны за выпуск І.А.Малашук**

**ДУК "Сетка публічных бібліятэк Глускага раёна"**
**Глуская цэнтральная раённая бібліятэка**